**Анофранка Н.В.**

# ПРАБЛЕМА СЛУЖБОВАЙ НЕАДПАВЕДНАСЦІ ЧЫНОЎНІКАЎ ГАРАДСКОЙ ПАЛІЦЫІ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XIX ст. (паводле дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)

Асноўныя прафесійныя і маральныя патрабаванні, якім павінен быў адпавядаць паліцэйскі чыноўнік першай трэці XIX ст. змяшчаліся ва «Уставе благочиния» пад назваю «Наказ управе благочиния». «Наказ» складаўся з правілаў «добронравия», правілаў грамадскіх абавязкаў і правілаў пасады. Першыя дзве часткі характарызавалі агульначалавечыя нормы паводзінаў, а апошняя замацоўвала патрабаванні, якія прад'яўляліся непасрэдна да паліцэйскіх чыноў. Чалавек, які знаходзіўся на паліцэйскай службе, павінен быў мець: «1) Здравый рассудок. 2) Добрая воля в отправлении порученного. 3) Человеколюбие. 4) Верность к службе Императорского Величества. 5) Усердие к общему добру. 6) Радение о должности. 7) Честность и бескорыстие» [11, с. 54; 12]. Аднак, незаўсёды прадстаўнікі паліцыі адпавядалі гэтым патрабаванням, пра што сведчаць дакументы цэнтральнага і мясцовага бюракратычнага апаратаў.

Скаргі на прафесійную неадпаведнасць паліцэйскіх чыноўнікаў былі даволі частымі. Напрыклад, у 1811 г. у ліставанні Мінсітэрства паліцыі з Мінскім грамадзянскім губернатарам падымалася тэма неадпаведнасці мінскага паліцмайстра Плескага займаемай пасадзе. Па выніках праверкі стацкі саветнік Крыжаноўскі паведамляў у Міністэрства паліцыі: «*полицейское управление в Минске весьма слабо и Полицмейстер Плеский на порядочное служение не способен*». У віну Плескаму быў пастаўлены кепскі нагляд за супрацьпажарным абсталяваннем: «*Инструментов пожарных: бочек, кручьев, вил, ведер и три трубы, но все сие недокончено, и под все то лошадей только шесть положено*». А таксама тое, што следчыя справы вяліся марудна і не вельмі якасна. У сувязі з гэтым рэвізор пісаў: «*Редкое дело нашел я выследованное основательно и окончательно*» [2, арк. 295]. У выніку гэтага ў астрогу збіраецца значная колькасць падсудных і арыштаваных. Аднак, даючы ацэнку іх утрыманню Крыжаноўскі адзначыў: «*Колодников в остроге нашел 58 человек. Содержатся довольно строго и опрятно*» [2, арк. 295 адв.].

Абапіраючыся на паведамленне стацкага саветніка Крыжаноўскага Міністр паліцыі загадаў Мінскаму грамадзянскаму губернатару разабрацца з пералічанымі недахопамі ў дзейнасці мінскага паліцмайстра. Невядома на колькі гэтыя абвінавачванні адпавядалі рэальнаму стану рэчаў, але паліцмайстар Плескі не толькі застаўся на сваёй пасадзе, але ў хуткім часе быў узнагароджаны ордэнам Св. Уладзіміра 4 ступені. У афіцыйным паведамленні гаварылася: «*Его императорское величество утвердил положение Комитета министров о награждении за усердную службу Минского полицмейстера надворного советника Плесского*» [2, арк. 403].

Варта адзначыць, што кадравая палітыка ў адносінах да паліцэйскіх чыноўнікаў, якіх быў яўны недахоп, з боку расійскага ўраду была дастаткова лагоднай. Гэта ілюструюць два супрацьлеглыя, але звязаных між сабой падзеі, што адбыліся ў Мінскай губерні ў 1811 г. У першым выпадку праводзілася следства супраць мазырскага праўніка Македонскага, які абвінавачваўся ў злоўжываннях. У ходзе гэтага працэсу паўстала пытанне пра адхіленне ад пасады мазырскага гараднічага Арыстава за «*сокрытие преступлений, в коих сей последний изобличается уже при начальном производстве следствия*» [2, арк. 342]. Другая ж справа датычылася ўзнагароды за выдатную службу бабруйскага гараднічага надворнага саветніка Ліліе. Генерал-лейтэнант Эссен, які шукаў для яго ўзнагароды, пісаў, што толькі дзякуючы высілкам гараданічага ў Бабруйску ўдалося ўтрыманне «*умеренных цен на жизненные припасы при столь многочисленном стеснении войск и содействии генерал-майору Игнатьеву к убеждению тамошних винных откупщиков к продаже на поруки нижним воинским чинам вина по 4,7 вместо установлений по округу цены по 6,7 ведра*»[2, арк. 373]. У выніку, гараднічы Ліліе быў не толькі прадстаўлены да ордэна, але распараджэннем Міністра паліцыі быў пераведзены ў горад Мазыр. А мазырскі гараднічы Арыстаў, які папярэдне быў абвінавачаны ў «*сокрытии преступлений*» праўніка Македонскага, замест поўнага адхілення ад пасады быў пераведзены на пасаду гараднічага ў горад Бабруйск [2, арк. 374, 378].

У 20-я гг. XIX ст. недахопы па службе паліцэйскіх чыноўнікаў і скаргі на іх маглі разглядацца і губернатарамі, і Сенатам. Напрыклад 24 сакавіка 1826 г. быў выдадзены сенацкі загад па справе полацкага паліцмайстра падпалкоўніка Штэрна. Паліцмайстар абвінавачваўся ў тым, што выпусціў з пад варты падазронага яўрэя Ізю Саламонава. На думку Сената, менавіта паліцмайстар Штэрн быў вінаваты ў тым, што вызвалены ім Саламонаў спачатку заключыў



Репозиторий ВГУ

кантракт з варонежскімі ямшчыкамі, якіх потым разам з Аронам Шмуйлером і абрабаваў. У якасці пакарання полацкі паліцмайстар павінен быў выплаціць падманутым варонежскім ямшчыкам 1400 рублёў [3, арк. 33–33 адв.].

Гэта быў не адзінкавы выпадак, падпалкоўнік Штэрн сапраўды не адпавядаў пасадзе паліцмайстра, як сведчылі скаргі гараджан. Так, на яго скардзіўся ў губернскае праўленне полацкі мешчанін Вельман. Ён пісаў, што Штэрн незаконна адабраў у яго 6 пар гадзіннікаў (гэта быў заклад на суму 335 рублёў ад гадзіннікавага майстра) [4]. А ў лютым 1826 г. ужо Дырэкцыя вучылішч Віцебскай губерні скардзілася Віцебскаму грамадзянскаму губернатару на тое, што паліцмайстар забараніў вучням Полацкага піярскага вучылішча «*на сюртуках мундировых шинелей и фраках мундирных не сметь носить красных суконных воротничков, а на шапочках или фуражках таковых же околышков*» [5, арк. 1]. Гэта распараджэнне супярэчыла пастанове 1824 года пра тайныя таварыствы, дзе ў адным з пунктаў сцвярджалася: «*чтобы ни один ученик не смел нигде находиться в ином одеянии как только в школьной униформе до окончания всех классов<...> Учащиеся имеют право ношения униформы для лучшего за ними наблюдения*». На падставе гэтага Дырэкцыя вучылішч Віцебскай губерні прасіла грамадзянскага губернатара зрабіць распараджэнне ўсім паліцыям, каб яны не перашкаджалі, як гэта зрабіў полацкі паліцмайстар Штэрн, выкананню вучэбнымі ўстановамі прадпісаных для іх правілаў [5, арк. 2].

Акрамя прафесійнай некампетэнтнасці чыноўнікі гарадской паліцыі абвінавачваліся і ў маральнай неадпаведнасці займаемым пасадам – злоўжыванне алкаголем, разбэшчаныя паводзіны і г.д. Напрыклад, генерал-губернатар М.М. Хаванскі ў 1829 г. пісаў Віцебскаму грамадзянскаму губернатару: «*Дошло до сведения моего, что режицкий городничий Хруцкий весьма нетрезвого поведения, и в сем состоянии делает упущения по должности. Прошу обратить внимание и мерами, какие вы признаете в сем случае нужными отвратить его от этого порока*» [9, арк. 1].

А некалькі раней, 1828 г., жыхары Віцебска абвінавачвалі ў амаральных паводзінах чыноўнікаў віцебскай гарадской паліцыі. У сувязі з гэтай справай Віцебскі і Магілёўскі генерал-губернатар пісаў Віцебскаму грамадзянскаму губернатару: «*Вашему превосходительству известно, что по силе "Устава Благочиния или Полицейского", в каждом городе вверено сохранение Благочиния добронравия и порядка единому месту под названием Управы Благочиния или Полицейской. <...> в данной оной Управе [как и всегдашнем зерцале ея] изображены <...> в точных и определенных чертах правила добронравия; правила обязательств общественных и качества определенного<...> Но к величайшему сожалению некоторые чины, составляющие сию полицию <...> не соответствуют столь святым установлениям закона ни в собственных качествах своих, ни в исполнении правил, должностью их предписанных*» [6, арк. 46–46 адв.]. Так, частны прыстаў тытулярны саветнік Курбацкі абвінавачваўся ў невыкананні шматлікіх ускладзеных на яго даручэнняў, а таксама ў махінацыях з грашовымі сумамі, якія да яго паступалі. На следчага прыстава Жызнеўскага «*от некоторых просителей наводятся сомнения о неодобрительных качествах его*». Частны прыстаў Мезгер «*по неоконченому еще делу подвергается нареканию в прелюбодейной жизни*». Частны прыстаў Грудзінскі таксама абвінавачваўся ў пралюбадзействе з віцебскай мяшчанкай Гваздовай. У адрозненні ад Мезгера, справа Грудзінскага разглядалася духоўнай й пастанавіла, якая пастанавіла: «*за наведения сомнения в супружеской к жене своей верности, посадить в Бабиновицкий тринитарский монастырь на месячное церковное покаяние*». Разам з іншымі ў разбэшчаных учынках гараджанамі абвінавачваўся і квартальны наглядчык Маеўскі [6, арк. 46 адв.].

Падсумоўваючы, генерал-губернатар М.М. Хаванскі пісаў Віцебскаму грамадзянскаму губернатару: «*видите сколь в малом числе чиновников витебской градской полиции, есть много примеров ненравственных и неблагочинных; и что сим то самым людям вверено охранение и соблюдение общественного благочиния, благонравия и порядка*» [6, арк. 47 адв.]. Тамсама М.М. Хаванскі адзначыў і вострую рэакцыю Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі: «*Витебская полиция как единое место в городе, долженствующее сохранять благочиние, благонравие и порядок делает сама понаровку распустуву*» [6, арк. 47 адв.].

Акрамя саміх фактаў амаральных паводзін паліцэйскіх генерал-губернатара абурылі дзеянні і віцебскага губернскага праўлення, якое запатрабавала каб паліцыя «*объяснила причину допущенного распустительства*». М.М. Хаванскі пісаў: «*Употребление сих слов Правлением <...> дает понимать: что распустительство действительно существует, и что Правление стремится не к искоренению оного, но что б знать причину для которой оно допущено; как будто*

Репозиторий ВГУ

*бы распуство может быть действием терпимым в каком-либо обществе, а только надо знать причину для которой оно допускается*» [6, арк. 48].

Генерал-губернатар М.М. Хаванскі распарадзіўся прызначыць для вядзення следства трох чыноўнікаў з бездакорнай рэпутацыяй. Першы быў прызначаны Віцебскім грамадзянскім губернатарам, другі – афіцэр унутранага гарнізоннага батальёна, а трэцім быў ад’ютант генерал-губернатара М.М. Хаванскага паручнік Мазнікоў. Нягледзячы на тое, што следства цягнулася з 1828 г. па 1830 г., яно не прывяло да нейкіх сур’ёзных наступстваў для паліцэйскіх чыноўнікаў. Як сведачаць дакументы і ў 1830 г. квартальны наглядчык Маеўскі, частны прыставў Грудзінскі, следчы прыставў Жызнеўскі працягвалі знаходзіцца ў штаце вітебскай паліцыі [6, арк. 144–145].

Гучная справа і працяглае разбіральніцтва па справе амаральных паводзін віцебскіх паліцэйскіх не вывела віцебскую паліцыю ў лік узорных. У 1830 г. працягвалі пастыпаць скаргі на паліцэйскіх  чыноўнікаў, якіх абвінавачвалі ў стварэнні «*беспорядков и претеснениях просителей*», а таксама ў п’янстве[10].

Акрамя прафесійнай некампетэнтнасці і маральнай-этычнай неадпаведнасці, паліцэйскія чыноўнікі здзейснялі сур’ёзныя службовыя злоўжыванні і злачынствы. Напрыклад, радавы Рэжыцкай інваліднай каманды Андрэй Якаўлеў у канцы 20-х гг. XIX ст. падаў скаргу на Рэжыцкага гараднічага, якога абвінавачваў у згвалтаванні жонкі. Такое абвінавачанне не магло быць праігнаравана і Віцебскі грамадзянскі губернатар загадаў чыноўніку па асобых даручэннях Панцелемонаву «*произвести сие следствие на законном основании*» [8, арк. 3].

Часам пра злачынныя ўчынкі паліцэйскіх чыноўнікаў рабілася вядомым не праз скаргі ахвяр ці датычных, а ў выніку службовых інтрыг ці помсты. Напрыклад, у 1828 г. Віцебскаму грамадзянскаму губернатару быў прадстаўлены рапарт полацкай гарадавой паліцыі са скаргаю на камандзіра мясцовай інваліднай каманды паручніка Пахомава. Ён абвінавачваўся ў тым, што чыніў перашкоды пры спробе затрымання полацкага мешчаніна Давіда Куклы, які абвінавачваўся ў падмане і парушэнні «*в обществе тишины*». Паручнік Пахомаў загадаў сваім падпарадкаваным не прапускаць паліцэйскіх у будынак унутранай варты, куды ён змясціў Давіда Куклу [7, арк. 1–3].

У адказ на гэта абвінавачанне паручнік Пахомаў падаў рапарт не грамадзянскаму губернатару, а генерал-губернатару М.М. Хаванскаму. У ім Пахомаў пералічваў шматлікія парушэнні як полацкага паліцмайстра падпалкоўніка Герасімовіча, так і ягонага памагатага квартальнага наглядчыка Касаржэўскага [7, арк. 16–16 адв.]. Так, квартальны наглядчык, па-першае, абвінавачваўся ў тым, што на Новы год, будучы ў нецвярозым стане, у высакародным сабранні парушыў цішыню і супакой, учыніў «*ужасную драку*», а па-другое, у тым, што без усякіх правоў і дакументаў, дзеля пахвальбы, насіў ордэн Св. Уладзіміра, на які не меў права. Аднак, у параўнанні з гэтымі правапарушэннямі абвінавачанні полацкага паліцмайстра Герасімовіча былі больш сур’ёзныя.

У ходзе следства, якое па загадзе генерал-губернатара праводзіў начальнік жандармскай каманды палкоўнік Мердэр, быў выяўлены цэлы шэраг парушэнняў, злоўжыванняў і злачынстваў [7, арк. 20]. Полацкі паліцмайстар для асабістых паездак, насуперак правілам, браў пажарных коней, а ў якасці кучараў выкарыстоўваў дзесяцкіх. Насіў элементы формы (эпалеты і пагончыкі) на якія не меў права ў адпаведнасці з чынам і пасадай. Ён займаўся махінацыямі з арэндай аднаго з гарадскіх будынкаў. Па яго распараджэнні без ветэрынарных дакументаў у горад быў прапушчаны «*гурт волов*». Дзве жывёлы з гэтага статка былі знойдзены памерлымі ад хваробы, што пагражала эпідэміяй. Герасімовіч збіраў праз фактора з яўрэяў-гандляроў па 20 капеяк за «*держание во время холода горшиков с жаром; замыкал лавки под видом запрещения и не дозволял торговать до тех пор пока не дастся ему по 40 (коп.) от каждой лавки*». Рыбакі скардзіліся на паліцмайстра за тое, што ён абкладаў іх «*податью дабы приносимо ему было в каждую пятницу лучшей рыбы от 12 до 20 фунтов*». Скрадзеныя ў «*секретарши новогрудской*» рэчы, якія былі знойдзены, былі вернутыя ёй Герасімовічам толькі пасля таго, як жанчына заплаціла яму 3 рублі срэбрам. Акрамя разнастайных выпадкаў вымагнняў, полацкі паліцмейстар не грэбаваў браць грошы ад злачынцаў. Так, у Полацку купец трэцяй гільдыі Іван Патарочын згвалтаваў адзінаццацігадовую дзяўчынку. Даведаўшся пра гэта Герасімовіч за «*оставление дела сего без исследования*» узяў з яго 200 рублёў.

На падставе ўсіх гэтых фактаў, прадстаўленых палкоўнікам Мердэрам, генерал-губернатар М.М. Хаванскій распарадзіўся адхіліць полацкага паліцмайстра падпалкоўніка Герасімовіча ад займаемай пасады на ўвесь час, пакуль ягоная справа будзе разглядацца ў адпаведных судовых інстанцыях. Адначасова аб прычынах, па якіх падпалкоўнік Герасімовіч «*оставляется без должно-*

Репозиторий ВГУ

*сти*» было паведамлена ў Камітэт 1814 г. (які не толькі ўплываў працаўладкаванне адстаўных ваенных, але і кантраляваў іх пенсійнае забеспячэнне). Часовае выканне функцый паліцмайстра Полацка было ўскладзена на люцынскага гараднічага капітана Ржэпіхоўскага [7, арк. 110–110 адв.].

Характэрнай рысай судаводства Расійскай імперыі першай паловы XIX ст. была маруднасць – судовая працэсы маглі зацягвацца, а канчатковае вынясенне прысудаў адкладвацца на гады. У гэты час чыноўнікі, у тым ліку і паліцэйскія, не звольненыя, а адхіленыя ад выканання службовых абавязкаў, працягвалі атрымліваць грашовае ўтрыманне ад казны. Пра гэта сведчыць справа барысаўскага квартальнага наглядчыка губернскага сакратара Ігнацій Блажэвіча. У 1827 г. квартальны наглядчык Блажэвіч быў абвінавачаны ў вымаганні грошаў ад гандляроў, якія прыязджалі ў Барысаў на кірмаш. Яго справа, за «*делаемые якобы им взятки*», была перададзена ў суд, аднак, вынясенне прысуду зацягнулася. У 1829 г. Блажэвіч звярнуўся з прашэннем у Сенат, у якім тлумачыў, што па законе, адхілены ад пасады паліцэйскі чыноўнік да канчатковай пастановы суда павінен атрымліваць палову жалавання. Ён жа, пры адсутнасці пастановы суда, ужо з 1 верасня 1827 г. увогуле перастаў атрымліваць жалаванне. Ігнацій Блажэвіч прасіў, каб Сенат распарадзіўся выдаць яму жалаванне і рабіць гэта ў адпаведнасці з законам да канчатковага рашэння суда. Сенат, разгледзіўшы гэтую справу, пацвердзіў, што ў час знаходжання пад судом Блажэвіч павінен артымліваць жалаванне ў адпаведнасці са сваім чынам [1, арк. 293–293 адв.].

У канцы 20-х гг. XIX ст., шукаючы шляхі павышэння эфектыўнасці паліцэйскага апарата, МУС і Сенат абмяркоўвалі меры спагнання з паліцэйскіх чыноў за «нерадение и упущение по службе». У выніку ў 1829 г. Сенат пастанавіў: «для побуждения их к большей исправности и рачению о своей должности, разрешить генерал-губернаторам, военным губернаторам, гражданским губернаторам подвергать нижних полицейских служителей (кроме полицмейстеров и городничих) временному аресту, когда по степени вины их начальники сии почтут нужным» [1, арк. 476].

Такім чынам, у першай трэці XIX ст. у гарадах беларуска-літоўскіх губерняў нярэдка ўзнікалі праблемы неадпаведнасці паліцэйскіх чыноўнікаў займаемым пасадам. Афіцыйныя вынікі праверак з боку цэнтральных органаў улады і мясцовых губернскіх адміністрацый (грамадзянскіх губернатараў, губернскіх праўленняў, генерал-губернатара), скаргі з боку гараджан у розныя інстанцыі на паліцмайстараў, гараднічых, квартальных адлюстроўваюць нізкую прафесійную кампетэнтнасць шэрагу паліцэйскіх чыноўнікаў, іх маральную неадпаведнасць займаемым пасадам. Таксама сярод паліцэйскіх чыноўнікаў мелі месца не толькі злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі ў асабістых мэтах, а таксама здзейсненне злачынстваў пры дапамозе службовых пасад. Спробы вырашыць кадравыя праблемы гарадской паліцыі (праверкі, спагнанні, адхіленні ад пасад і г.д. ) не прыносілі адчувальнага плёну.


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 277. Т. 2.
2. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 94. Т.3.
3. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 499.
4. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 513.
5. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 528.
6. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 647.
7. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1247
8. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1790.
9. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 1989.
10. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 2025.
11. Пинигин, М. Г. Организационно-правовые основы деятельности полиции в Российской империи по «Уставу благочиния или полицейскому» (1782–1862 гг.) : дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.01 / М. Г. Пинигин – Москва, 2003. – 180 с.
12. Полное Собрание Законов Российской Империи : Собрание первое : С 1649 по 12 декабря 1825 года. – СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е.И.В. Канцелярии, 1830. – Т. XXI. – № 15379. – С. 465.



**Митрофанов В.В.**


## АДМИНИСТРАТИВНОЕ ДЕЛЕНИЕ И СОЦИАЛЬНЫЙ СОСТАВ НАСЕЛЕНИЯ ТОБОЛЬСКА В 1826 ГОДУ

По меткому замечанию Г.Н. Потанина «города Сибири – это точки на общественном теле Сибири, которыми оно воспринимает лучи света, идущие с Запада» [11, с. 234].

Тобольск, основанный одним из первых, в 1587 г. [16, с. 44], на только что присоединенных территориях Западной Сибири, получил вскоре статус города (1590). На протяжении XVI–XVIII вв. он являлся военным, административным, политическим, церковным и культурным центром на огромном пространстве от Урала до Тихого океана. Как заметил С.Ф. Платонов,

Репозиторий ВГУ